2. Новейшая история стран Европы и Америки. XX век : учеб. для студ. высш. учеб. заведений: в 2 ч. / под ред. А. М. Родригеса и М. В. Пономарёва. – М. : Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 2003. – Ч. 1: 1900–1945. – 464 с.

3. Розанов, Г. Л. Новейшая история (1917–1945) : пособие для учителей / Г. Л. Розанов, Н. Н. Яковлев. – 3-е изд., перераб. и доп. – М. : Просвещение, 1972. – 271 с.

4. Язьков, Е. Ф. История стран Европы и Америки в новейшее время (1918–1945): курс лекций / Е. Ф. Язьков. – М. : Изд-во МГУ ; ИНФРА-М, 2000. – 352 с.

5. Военно-исторический словарь. – Минск : Харвест, 2005. – 992 с.

6. Советский энциклопедический словарь / под ред. А. М. Прохорова. – 4-е изд. – М. : Сов. энциклопедия, 1989. – 1632 с.

7. Системная история международных отношений : в 4 т. : 1918–2000. – М. : Московский рабочий, 2000. – Т. 2: Документы 1910–1940–х гг. – 243 с.

8. Кошелев, В. С. Всемирная история, XIX – начало XXI в. : учеб. пособие для 11-го кл. общеобразоват. учреждений с рус. яз. обучения / В. С. Кошелев ; метод. обеспечение М. А. Красновой. – Минск : Изд. центр БГУ, 2009. – 239 с.

9. Субботин, О. «Рейнская политика Франции» (1918–1919) / О. Субботин // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2007. – № 9. – С. 40–44.

10. Möller, H. Europa zwischen den Weltkriegen / H. Möller. – München, 1998. – 278 s.

УДК 94:327((47+57):438:430)«1922»

**М. М. Мязга**
Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Ф. Скарыны

# ДЫПЛАМАТЫЧНЫЯ МАНЕЎРЫ Ў ТРЫКУТНІКУ МАСКВА – ВАРШАВА – БЕРЛІН У КАНТЭКСЦЕ ПАДРЫХТОЎКІ ГЕНУЭЗСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ 1922 ГОДА

*У артыкуле разгледжаны адносіны паміж Расіяй, Польшчай і Германіяй у кантэксце падрыхтоўкі Генуэзскай міжнароднай канферэнцыі 1922 г. Устаноўлена, што ў адносінах паміж названымі дзяржавамі прысутнічалі супярэчлівыя тэндэнцыі. З аднаго боку, наяўнасць агульных інтарэсаў на планаванай канферэнцыі садзейнічала збліжэнню паміж імі.*

*З іншага боку, у адносінах паміж Масквой, Варшавай і Берлінам заставаліся вострыя супярэчнасці, што, разам з розным месцам гэтых дзяржаў у Версальскай сістэме, рабіла тэндэнцыю да збліжэння няўстойлівай.*

Міжнародны парадак, створаны Версальскім дагаворам, таіў у сабе не толькі вострыя палітычныя супярэчнасці, але і стварыў прынцыпова адрозную ад даваеннай сістэму эканамічнага ўзаемадзеяння паміж еўрапейскімі дзяржавамі. З агульнай эканамічнай сістэмы выпала Расія. Утварэнне шэрагу новых незалежных дзяржаў у Цэнтральна-Усходняй Еўропе, правядзенне новых межаў прывяло да разбурэння ранейшых эканамічных сувязяў. Гэтыя абставіны ўзмацнялі эканамічныя цяжкасці, з якімі сутыкалася Еўропа пасля заканчэння Першай сусветнай вайны. Палітычныя эліты вядучых еўрапейскіх дзяржаў прыходзілі да ўсведамлення таго, што для эканамічнага аднаўлення кантынента неабходныя ўзгодненыя дзеянні на міждзяржаўным узроўні з удзелам у тым ліку і Савецкай Расіі. Названыя абставіны і падштурхнулі лідэраў Англіі і Францыі прыняць рашэнне аб скліканні міжнароднай канферэнцыі па эканамічных пытаннях ў Генуі.

Гісторыя Генуэзскай канферэнцыі даўно з'яўляецца прадметам вялікай увагі гісторыкаў. У ліку апошніх работ расійскіх аўтараў адзначым манаграфію В. Ю. Касатонава. У ёй разгледжаны шэраг важных аспектаў, звязаных з падрыхтоўкай да канферэнцыі Савецкай Расіі, прадстаўлены працэс узгаднення пазіцый заходнімі дзяржавамі напярэдадні канферэнцыі [1]. Пытанні падрыхтоўкі Савецкай Расіі да ўдзелу ў канферэнцыі разглядаюцца і ў манаграфіі В. А. Шышкіна [2]. Шэраг даследаванняў прысвечана характарыстыцы палітыкі вядучых дзяржаў Захаду ў кантэксце падрыхтоўкі да канферэнцыі. Так, Е. Ю. Сяргееў выявіў асноўныя палажэнні брытанскай палітыкі ў сувязі з маючай адбыцца канферэнцыяй, у прыватнасці, у адносінах да Савецкай Расіі [3]. Міжнародна-палітычная сітуацыя ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе ў кантэксце падрыхтоўкі Генуэзскай канферэнцыі грунтоўна даследавана ў манаграфіі В. А. Зубачэўскага [4]. Кароткі агляд гістарыяграфіі дазваляе зрабіць выснову аб адсутнасці работ, прадметам даследавання якіх стала б палітыка Расіі, Германіі і Польшчы ў кантэксце падрыхтоўкі Генуэзскай канферэнцыі з улікам узаемазалежнасці знешнепалітычных крокаў трох названых краін. Кожная з іх, імкнучыся дасягнуць на будучай канферэнцыі пэўных мэтаў, усведамляла, што вынік шмат у чым будзе залежаць не толькі ад вядучых дзяржаў Захаду, але і ад пазіцый партнёраў па "трыкутніку" Масква – Берлін – Варшава. Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца ахарактарызаваць адносіны паміж Расіяй, Польшчай і Германіяй у кантэксце падрыхтоўкі Генуэзскай канферэнцыі.

Дыпламатычныя крокі Масквы, Варшавы і Берліна напярэдадні Генуі вызначаліся існуючымі міжнароднымі ўмовамі, тымі мэтамі, якія яны праследавалі на міжнароднай арэне ва ўмовах існуючага міжнароднага парадку. Для расійскага ўрада ключавой была задача атрымання эканамічнай дапамогі для аднаўлення гаспадаркі краіны. Зыходзячы з гэтага, будавалася стратэгія на будучай канферэнцыі. Вядома выказванне У. І. Леніна аб тым, што прадстаўнікі савецкага ўрада едуць у Геную як купцы. Але старшыня СНК не звязваў атрыманне садзейнічання Захаду ў аднаўленні эканомікі Расіі выключна з Генуэзскай канферэнцыяй. 10 лютага ён пісаў наркаму замежных спраў Г. В. Чычэрыну, што для савецкага ўрада будзе выгадны зрыў канферэнцыі, але, каб яго не звязвалі з савецкай дэлегацыяй. І далей У. І. Ленін тлумачыў сваю пазіцыю: “Пазыку мы атрымаем лепш без Генуі, калі Геную сарвем не мы” [5, с. 504].

Г. В. Чычэрын лічыў неабходным выкарыстаць Геную для дасягнення эканамічнага пагаднення з капіталістычнымі краінамі, бо аднаўленне эканомікі Расіі немагчыма без прыцягнення замежнага капіталу. Наркам пісаў: “Наша дыпламатыя праследуе ў канчатковым выніку вытворчыя мэты, нашу знешнюю палітыку мы пастаянна характарызуем як вытворчую палітыку, якая ставіць сабе мэтай спрыяць інтарэсам вытворчасці ў Расіі” [2, с. 122]. Менавіта ў кантэксце падрыхтоўкі да Генуэзскай канферэнцыі савецкая дыпламатыя дэманструе паварот ад жорсткага супрацьстаяння з капіталістычным светам да эканамічнага супрацоўніцтва з ім. Аднак гэты паварот не быў безумоўным. Нават такі актыўны прыхільнік рэальнай палітыкі як Г. В. Чычэрын лічыў неабходным выкарыстаць канферэнцыю для выкладу праграмы перш за ўсё ў інтарэсах сусветнай рэвалюцыі. Але паколькі яна наступіць пазней, бліжэйшай задачай з’яўляецца эканамічнае аднаўленне краіны, прычым з дапамогай заходніх дзяржаў [6, с. 85, 87]. Для вырашэння гэтай задачы савецкая дыпламатыя імкнулася манеўраваць паміж рознымі дзяржавамі, выкарыстоўваючы іх зацікаўленасць у эканамічных сувязях з Расіяй. У. І. Ленін ставіў задачу перад савецкай дэлегацыяй у Генуі: “... раз’яднаць паміж сабой аб’яднаныя ў Генуі супраць нас буржуазныя краіны” [7, с. 432].

У планах савецкага кіраўніцтва “раз’яднаць буржуазныя краіны” важная роля адводзілася Германіі. Напярэдадні канферэнцыі Берлін дэманстраваў салідарную пазіцыю з краінамі Захаду ў пытанні эканамічнага аднаўлення Расіі, але імкнуўся не дапусціць, каб яго вынікам стала эканамічная залежнасць савецкай краіны ад дзяржаў Антанты. 8 лютага 1922 г. канцлер Й. Вірт заявіў у рэйхстагу: “Мы будзем вітаць прапановы любога трэцяга боку працаваць у гэтым кірунку

[эканамічнага аднаўлення Расіі] сумесна з намі і ў згодзе з Расіяй". Пры гэтым кіраўнік германскага ўрада адзначыў, што аднаўленне Расіі павінна праводзіцца ў згодзе з ёй, і недапушчальна, каб з Расіяй абыходзіліся як з калоніяй [7, с. 427]. Дадзеная пазіцыя Берліна давала Маскве шанец атрымаць падтрымку Германіі ў супрацьстаянні дыктату з боку Антанты.

Для германскага ўрада адным з важных матываў паляпшэння адносін з Расіяй было сумеснае супрацьстаянне Польшчы. К. Радэк, які знаходзіўся ў Берліне, паведамляючы 11 лютага ў Маскву аб сваёй гутарцы з камандуючым рэйхсверам Х. фон Сектам, адзначыў рэзкія антыпольскія заявы генерала: "Яна [Польшча] павінна быць раздушаная, і яна будзе раздушаная, як толькі Расія ці Германія ўзмацняцца" [8, с. 335]. У сувязі з планамі выкарыстоўваць Расію ў сваёй антыпольскай палітыцы Германія выяўляла пастаянную цікавасць да стану савецка-польскіх адносін. 17 лютага пасол у Берліне паведамляў у польскае МЗС аб гутарцы з міністрам замежных спраў В. Ратэнау. Польскі дыпламат зрабіў выснову, што германскія ўрадавыя колы больш за ўсё цікавіць стан адносін Польшчы з Расіяй. В. Ратэнау выказаўся за наладжванне эканамічных адносін з Польшчай [9, ł. 4–5]. Пэўная дэманстрацыя германскім бокам гатоўнасці да паляпшэння адносін з Польшчай у сярэдзіне лютага павінна разглядацца ў кантэксце развіцця германа-савецкіх адносін. Менавіта ў гэты момант зайшлі ў тупік перамовы паміж Расіяй і Германіяй. Аднак тэндэнцыя да паляпшэння германа-польскіх адносін у тых умовах не магла быць устойлівай. Ужо ў канцы сакавіка можна казаць аб нарастанні напружанасці ў іх. У дадзеным выпадку падставай стала сітуацыя вакол Усходняй Прусіі, дзе была разгорнута магутная антыпольская кампанія, якая выклікала пратэст польскага МЗС [10, с. 28].

У Маскве ў той момант былі сумненні адносна неабходнасці ісці на саступкі Германіі дзеля пагаднення з ёй да канферэнцыі. Г. В. Чычэрын у лісце ў Палітбюро ЦК РКП(б) ад 8 лютага пісаў, што напярэдадні Генуі не варта ісці на якія-небудзь эканамічныя саступкі Германіі дзеля дасягнення пагаднення. Апраўданнем такіх саступак не магло стаць нават усталяванне дыпламатычных адносін з Германіяй. Наркам замежных спраў ставіў пад сумненне саму мэтазгоднасць іх устанаўлення да канферэнцыі [11, с. 49]. Можна меркаваць, што Г. В. Чычэрын апасаўся, як бы пагадненне з Германіяй не зрабіла больш жорсткай пазіцыю Антанты ў Генуі і не звузіла прастору для манеўру савецкай дыпламатыі. К. Радэк у ўжо згаданай гутарцы з Х. фон Сектам зрабіў выснову, што ва ўсіх палітычных колах Германіі расце ўсведамленне неабходнасці супрацоўніцтва з Расіяй. Гэта не зменяць ніякія зігзагі савецкай ці германскай палітыкі [8, с. 335]. Істотнай передумовай

для паляпшэння савецка-германскіх адносін была зацікаўленасць немцаў у развіцці эканамічных сувязяў з Расіяй. Як паказаў у сваіх даследаваннях А. А. Ахтамзян, у ходзе падрыхтоўкі да Генуэзскай канферэнцыі германская дыпламатыя і гаспадарчыя органы распрацоўвалі мерапрыемствы, накіраваныя на глыбокае пранікненне ў эканоміку Савецкай Расіі [12, с. 44]. Улічваючы ўстойлівую цікавасць Германіі да нармалізацыі адносін з Расіяй, савецкаму ўраду можна было не фарсіраваць дасягненне пагаднення з ёй да Генуі, тым больш, як будзе паказана далей, і самі немцы не імкнуліся да такога развіцця падзей.

Адносна палітыкі Польшчы ў кантэксце падрыхтоўкі Генуэзскай канферэнцыі савецкае кіраўніцтва зыходзіла з высокай ступені яе зацікаўленасці ў эканамічным аднаўленні Расіі і наладжванні з ёю гаспадарчых сувязяў. Пра гэта сведчыць змест гутаркі члена Калегіі Наркамата замежных спраў (НКЗС) Я. С. Ганецкага з польскім паверанымі у справах у Маскве 23 сакавіка. Савецкі дыпламат адзначыў, што развіццё прамысловасці Польшчы “безумоўна залежыць ад расійскага рынку. Таму Польшча зацікаўлена ва ўдзеле замежных капіталаў у максімальна хуткім аднаўленні расійскай эканомікі” [13, s. 152]. Словы савецкага дыпламата адлюстроўвалі пазіцыю польскіх дзелавых колаў. 9 лютага прэм’ер-міністру краіны была перададзена рэзалюцыя Польскага політэхнічнага таварыства, аўтары якой патрабавалі ўстанаўлення гандлёвых адносін з Расіяй і забеспячэння там рынку збыту для польскай прамысловасці, заключэння гандлёвага дагавора паміж дзвюма краінамі [14, с. 140].

Масква была занепакоеная магчымасцю запрашэння на канферэнцыю ўрадаў, якія ў свой час былі прызнаныя дэ-юрэ краінамі Антанты. 6 лютага савецкая дэлегацыя ў Італіі звярнулася ў МЗС гэтай краіны з просьбай паведаміць расійскаму ўраду ці мяркуецца запрашэнне на Генуэзскую канферэнцыю “таксама і тых паўшых у цяперашні ўрадаў, утвораных на тэрыторыі былой Расійскай імперыі, якія ў свой час былі прызнаныя дэ-юрэ саюзнымі дзяржавамі, ... а менавіта: былыя ўрады каўказскіх рэспублік і контррэвалюцыйныя ўрады генералаў Дзянікіна і Урангеля, якія абвясцілі сябе юрыдычнымі спадчыннікамі так званага ўрада адмірала Калчака”. У савецкай ноце ўтрымлівалася папярэджанне, што запрашэнне названых урадаў зрабіла б немагчымым удзел у канферэнцыі Расіі [15, с. 81–82]. У адказе італьянскага ўрада адзначалася, што арганізатары канферэнцыі не маюць на ўвазе запрашэнне ні расійскіх контррэвалюцыйных урадаў, ні ўрадаў дзяржаў Каўказа [15, с. 83]. Але гэты адказ не зняў цалкам апасенні Масквы, і савецкае кіраўніцтва праз паляпшэнне адносін з Польшчай імкнулася пазбавіць эмігранцкія ўрады, перш за ўсё грузінскі, яе падтрымкі.

Польская палітычная эліта ў сувязі з падрыхтоўкай Генуэзскай канферэнцыі прыйшла да новага бачання ролі “рускага пытання” ў палітыцы сваёй краіны. У мемарандуме Усходняга аддзела МЗС ад 21 лютага адзначалася, што да гэтага моманту польская палітыка ў адносінах да Савецкай Расіі разглядалася ў асноўным у кантэксце двухбаковых адносін і зводзілася галоўным чынам да выканання Рыжскай дамовы. Цяпер жа “рашэнне расійскай праблемы становіцца на адно з першых месцаў сярод актуальных пытанняў міжнародных адносін. У сувязі з гэтым колькасць фактараў, якія рэгулююць савецка-польскія адносіны, пашыраецца”. Польскія дыпламаты звярнулі ўвагу на прымірэнчую пазіцыю Англіі і Германіі ў адносінах да Расіі, бо яны зацікаўлены ў аднаўленні яе эканомікі [13, s. 138]. У мемарандуме польскага МЗС, таксама датаваным лютым 1922 г., адзначаецца дамінаванне ў еўрапейскай палітыцы новай тэндэнцыі да мірнага суіснавання з Савецкай Расіяй. Да гэтай тэндэнцыі Польшча павінна прыстасавацца. Ёй варта было атрымаць карысць з ролі пасярэдніка паміж Захадам і Расіяй, пасярэдніка, які можа быць як мостам, так і бар'ерам. Гэтую пазіцыю трэба было даводзіць да бальшавіцкіх палітыкаў [16, s. 146–147]. Фактычна не выключаўся ціск на Маскву праз ператварэнне Польшчы ў бар'ер паміж Расіяй і Захадам, калі пры аднаўленні расійскай эканомікі не будуць улічаны польскія інтарэсы.

Пры гэтым польскія палітыкі асцерагаліся, што “расійскае пытанне” можа выклікаць раскол сярод заходніх саюзнікаў. У распрацоўках Усходняга аддзела МЗС Польшчы адзначалася, што ў яе інтарэсах захаванне адзінства паміж саюзнікамі па Антанце, бо на англа-французскі саюз абапіраецца пасляваенная еўрапейская палітыка. А на той момант, на думку польскіх дыпламатаў, праходзіла актыўнае збліжэнне Англіі з Германіяй, і гэтая групоўка была схільная да пагаднення з бальшавікамі. Францыя ж займала найбольш непрымірымую пазіцыю ў адносінах да савецкага ўраду [13, s. 138–139]. У такой сітуацыі польскія палітычныя колы лічылі мэтазгодным празандаваць стаўленне Масквы да магчымага паляпшэння адносін з Францыяй. К. Радэк інфармаваў 17 лютага Маскву аб кантактах з польскімі дыпламатамі ў Берліне. Дырэктар палітычнага дэпартамента польскага МЗС Залескі і першы саветнік польскага пасольства ў Парыжы Люкасевіч паведамілі, што мэтай іх прыезду ў сталіцу Германіі з'яўляецца садзейнічанне савецка-французскаму збліжэнню, якое адпавядае інтарэсам Польшчы. Пры гэтым яны спасылаліся на мінулыя кантакты паміж савецкімі і польскімі дыпламатамі ў Маскве і Варшаве [8, с. 344].

На думку кіраўніцтва Усходняга аддзела МЗС Польшчы, яна павінна была ўзгадніць сваю пазіцыю з Малой Антантай, краінамі

Прыбалтыкі і Францыяй, што дазволіла б ёй больш упэўнена адчуваць сябе на Генуэзскай канферэнцыі. Але пры гэтым важна было перакanaць Маскву, што гэта аб'яднанне не накіравана супраць Расіі [13, s. 140]. Аднак у польскага ўрада было адно ключавое разыходжанне з вялікім дзяржавамі адносна эканамічнага аднаўлення Расіі. У Варшаве разумелі, што ў выпадку рэалізацыі праекта міжнароднага кансорцыума адносна невялікая Польшча не будзе адыгрываць у ім значную ролю. Таму польскі ўрад імкнуўся наладзіць прамое эканамічнае супрацоўніцтва з Расіяй [13, s. 141]. Такая пазіцыя давала магчымасць Варшаве і Маскве знаходзіць агульныя падыходы да пытанняў будучай канферэнцыі.

Для Польшчы ключавой міжнароднай праблемай на той момант з'яўлялася прызнанне Захадам Рыжскай дамовы і ўсталяванай ёю мяжы, роўна як і ўваходжання ў склад Польшчы Віленшчыны і Усходняй Галіцыі. Пасольства ў Парыжы інфармавала МЗС Польшчы, што ў выпадку пастаноўкі ў Генуі пытання аб прызнанні Рыжскага дагавора, Англія можа зрабіць агаворкі адносна Усходняй Галіцыі. Польскі ўрад ускладаў надзею на дыпламатычную дапамогу Францыі ў вырашэнні галіцыйскага пытання ў адпаведнасці з польскімі інтарэсамі [17, s. 422]. У Варшаве зыходзілі з таго, што прызнанню Рыжскага дагавора садзейнічала б прызнанне краінамі Захаду Савецкай Расіі. У пасланні дырэктара Палітычнага дэпартамэнту МЗС часоваму паверанаму ў справах у Маскве ад 7 сакавіка адзначаецца зацікаўленасць Польшчы, як і Расіі, у прызнанні вядучымі дзяржавамі Рыжскай дамовы. Пра важнасць гэтага прызнання для Польшчы сведчыць яе гатоўнасць для дасягнення названай мэты падтрымаць Расію ў справе прызнання яе заходнімі дзяржавамі, устрымацца ад "прыніжэння аўтарытэту Расіі праз прадстаўленне рэальнага становішча спраў з выкананнем Рыжскага дагавора". Варшава гатовая была падтрымаць намаганні Савецкай Расіі заняць раўнапраўнае месца з іншымі дзяржавамі Еўропы. Дзеля дасягнення паразумення з Расіяй Польшча гатовая была не падтрымліваць прадстаўнікоў антысавецкіх урадаў, прызнаных дэ-юрэ Антантай, у справе іх запрашэння ў Генуя. Але пры гэтым Польшча настойвала, што "з боку Расіі не павінна быць прадпрынята нічога такога з палітычнага пункту гледжання, што ішло б у разрэз з Рыжскім дагаворам" [13, s. 146–147]. Зразумела, што адступленне ад палітычных палажэнняў Рыжскага дагавора магло паставіць пад сумненне ўсталяваную ім мяжу.

Выкладзеныя вышэй факты сведчаць, што ў кантэксце падрыхтоўкі да Генуэзскай канферэнцыі ў савецка-польскіх адносінах намецілася тэндэнцыя да пацяплення. Польшча гатовая была ісці насустрач Расіі пры развязанні шэрагу міжнародных пытанняў. Масква са

свайго боку дэманстравала гатоўнасць не абвастраць адносіны з Варшавай. Так, калі ў канцы студзеня 1922 г. Г. В. Чычэрын выказаўся супраць выступлення Расіі ў абарону польскіх камуністаў, якія падвяргаліся рэпрэсіям, Палітбюро падтрымала яго пазіцыю. Неабходнасць паляпшэння адносін з Польшчай наркам замежных спраў тлумачыў жаданнем вызваліць яе з-пад уплыву Пуанкарэ [18]. Пазіцыі Расіі і Польшчы супалі ў той момант па шэрагу міжнародных пытанняў: прызнанне Антантай савецкага ўрада, негатыўнае стаўленне да ідэі стварэння міжнароднага кансорцыума з мэтай аднаўлення Расіі. Але пры гэтым у адносінах паміж Масквой і Варшавай заставалася шмат спрэчных момантаў, на іх характар уплываў узаемны недавер. У наратыве савецкай дыпламатыі захоўваўся тэзіс аб агрэсіўнасці Польшчы. Яго, у прыватнасці, у сярэдзіне сакавіка агучыў Я. С. Ганецкі ў гутарках з польскім і фінляндскім прадстаўнікамі ў Маскве. Савецкі дыпламат адзначыў, што Польшча "становіцца небяспечным суседам, заўсёды гатовым справакаваць вайну" [13, s. 151]. У польскага кіраўніцтва заставаліся апасенні адносна савецка-германскага супрацоўніцтва на антыпольскай аснове. 22 студзеня пасольства Польшчы ў Берліне паведаміла ў Варшаву, што ў германскай сталіцы адбыліся перамовы паміж расійскімі і германскімі прадстаўнікамі, падчас якіх РСФСР прапанавала рэарганізаваць германскае часовае прадстаўніцтва, якое функцыянуе ў Маскве, у пасольства. Узамен савецкі бок выказаў гатоўнасць даць Германіі кампенсацыю за забойства Мірбаха [19, ł. 1]. 3 сакавіка МЗС накіравала паведамленне ў пасольства ў Берліне, у якім гаварылася пра выступленне Л. Д. Троцкага яшчэ ў студзені 1922 г. з "планам саюза з Германіяй". Гэты саюз, на думку польскіх дыпламатаў, быў патрэбны Расіі перш за ўсё для закупак зброі і з мэтай падрыхтоўкі адпаведнага дагавора ў Берлін быў накіраваны К. Радэк [19, ł. 5–6]. Польскія палітычныя колы зыходзілі з рэальнасці ваеннай пагрозы з боку Расіі. На пасяджэнні Палітычнага камітэта савета міністраў Польшчы 17 сакавіка адзначалася канцэнтрацыя савецкіх войскаў на польскай мяжы. У сувязі з гэтым было прынята рашэнне затрымаць дэмабілізацыю прызыўнікоў 1899 г. да 1 чэрвеня 1922 г., а міністру замежных спраў даручалася накіраваць ноту савецкаму ўраду з пералікам ваенных прыгатаванняў Расіі" [14, с. 142–143].

У Масквы заставаліся вялікія апасенні адносна польскай палітыкі ў Прыбалтыцы, вынікам якой магло стаць стварэнне польска-балтыйскага блока, які супрацьстаяў бы Расіі. У інструкцыі дырэктара Палітычнага дэпартамента МЗС часоваму паверанаму ў справах у Маскве ад 7 сакавіка адзначалася: "У сувязі з Генуэзскай канферэнцыяй

найважнейшымі для нас застаюцца перамовы ў розных напрамках, якія маюць на мэце ўзгадненне па меры магчымасці пэўных прынцыповых поглядаў, што дало б нам магчымасць у патрэбны момант дасягнуць узгодненага выступлення, калі ў тым узнікла б неабходнасць. Мы накіравалі намаганні роўна ў напрамку вялікіх дзяржаў, як і аб'яднанняў меншых дзяржаў" [13, s. 145]. Расія негатыўна рэагавала на імкненне Польшча ўзгадніць сваю пазіцыю па пытаннях маючай адбыцца канферэнцыі з пазіцыяй максімальна большай колькасці дзяржаў, каб мець іх падтрымку. Вышэй адзначалася, што намаганні савецкай дыпламатыі былі нацэлены на раскол капіталістычных дзяржаў і выкарыстанне супярэчнасцяў паміж імі.

У сакавіку Варшава паставіла ў парадак дня правядзенне польска-балтыйскай канферэнцыі. 3 сакавіка міністр замежных спраў К. Скірмунт паведаміў пасольству ў Лондане аб намеры ўзгадніць з Малой Антантай і краінамі Прыбалтыкі ў сувязі з Генуяй пазіцыю па двух пытаннях: пацвярджэнне непарушнасці мірных дагавораў і роўнасць усіх дзяржаў на канферэнцыі. Для гэтага планавалася 11 сакавіка сустрэча ў Варшаве прадстаўнікоў краін Балтыі, а 15 сакавіка – прэм'ер-міністраў краін Малой Антанты [17, s. 428]. У савецкага кіраўніцтва планы такой сустрэчы выклікалі апасенні адносна яе антысавецкай накіраванасці, пра што Я. С. Ганецкі паведаміў паверанаму ў справах Польшчы ў Маскве З. Стэфаньскаму падчас іх гутаркі 6 сакавіка. Савецкі дыпламат назваў дадзеную сустрэчу без удзелу ў ёй Расіі не карыснай для савецка-польскіх адносін [13, s. 142]. У ходзе Варшаўскай канферэнцыі 17 сакавіка Польшчы, Эстоніі, Фінляндыі і Латвіі было падпісана пагадненне, удзельнікі якога абавязаліся ўзаемна прызнаць мірныя дагаворы з Савецкай Расіяй і цесна супрацоўнічаць пры правядзенні знешняй палітыкі [20, с. 148]. Галоўная мэта польскай дыпламатыі заключалася ў правядзенні адзінай палітыкі ў адносінах да Расіі з балтыйскімі краінамі. З. Стэфаньскаму польскае МЗС даручала каардынаваць з пасламі Фінляндыі, Эстоніі і Латвіі ў Маскве ў адпаведнасці з рашэннямі Варшаўскай канферэнцыі крокі, накіраваныя на забеспячэнне выканання Расіяй мірных дагавораў з названымі дзяржавамі [14, с. 144].

Адным з фактараў, які адмоўна ўплываў на характар савецка-польскіх адносін, была дзейнасць на тэрыторыі Польшчы белагвардзейскіх арганізацый. 11 сакавіка Масква ў гэтай сувязі накіравала ноту пратэсту Варшаве, у якой заявіла: "Расія не будзе рабіць адрозненні паміж рэгулярнымі польскімі войскамі і ўзброенымі атрадамі, да якой бы нацыянальнасці апошнія не належалі, паколькі гэтыя атрады будуць

нападаць на Расію з тэрыторыі Польскай Рэспублікі з прычыны садзейнічання або папушчальніцтва польскіх уладаў” [15, с. 147]. Па сутнасці, гэта была пагроза разглядаць дзеянні белагвардзейскіх фарміраванняў як факт агрэсіі з боку польскай дзяржавы. Аб зацікаўленасці Польшчы ў паляпшэнні стасункаў з Расіяй напярэдадні Генуі сведчыць і той факт, што ў пытанні аб белагвардзейскіх арганізацыях яна гатовая была ісці насустрач патрабаванням Расіі. На пасяджэнні Палітычнага камітэта савета міністраў Польшчы 17 сакавіка было прынята рашэнне аб нейтралізацыі тайнай дзейнасці рускіх манархічных арганізацый у Польшчы, а то і выдаленні гэтых арганізацый з тэрыторыі краіны. Міністр унутраных спраў павінен быў да 30 сакавіка даць справаздачу ўраду аб выкананні гэтага рашэння [14, с. 142]. І сапраўды, як паведамлялася ў дэпешы МЗС Польшчы пасольству ў Лондане, у Варшаве былі зробленыя арышты ў расійскіх манархічных колах. Палякі пазіцыянавалі гэта як дэманстрацыю мірных намераў у адносінах да савецкага ўраду [17, s. 436]. Напярэдадні Генуэзскай канферэнцыі Польшча выказвала гатоўнасць ісці на саступкі Расіі нават у такім прынцыповым пытанні, як выкананне апошняй матэрыяльных абавязанняў паводле Рыжскага дагавора. На гэта, як і на польскія саступкі ў іншых пытаннях, звярталася ўвага савецкага ўрада ў ноце, накіраванай яму МЗС Польшчы 18 сакавіка [21, л. 19].

Да канца сакавіка ў польскіх дыпламатычных колах пазначыліся контуры магчымага пагаднення з Расіяй. МЗС прапаноўвала ўключыць у яго абавязацельства Расіі і Украіны падтрымліваць намаганні Польшчы і іншых суседніх з Расіяй дзяржаў па прызнанні падпісаных трактатаў у цэласнасці, асабліва што тычыцца лініі ўстаноўленых імі межаў. Савецкія рэспублікі таксама павінны былі пагадзіцца не рабіць крокі, якія супярэчылі б Версальскаму дагавору ў яго палажэннях, якія тычацца еўрапейскіх адносін. Палякі ўсё ж разлічвалі дамагчыся выканання савецкім урадам матэрыяльных абавязацельстваў па Рыжскаму дагавору: 1) выплаты 30 млн. руб. золатам; 2) выплаты другога і трэцяга ўзносаў за чыгуначную маёмасць. Са свайго боку Польшча гатовая была падтрымаць Украіну і Расію ў справе наладжвання стасункаў з Захадам і процідзейнічаць стварэнню адзінага кансорцыума для эксплуатацыі Расіі і падзелу яе на сферы ўплыву. Польскі ўрад гатовы быў абмяркоўваць прыняцце на сябе часткі царскіх даўгоў, згаджаўся не падтрымліваць антысавецкія ўрады ў эміграцыі і браў абавязацельства не дапусціць пераходу балтыйскіх дзяржаў на антысавецкія пазіцыі [13, s. 154–155].

Дасягненне савецка-польскага пагаднення на названай аснове ўяўляецца вельмі сумніўным. Расія не была зацікаўлена ў міжнародным прызнанні межаў, устаноўленых Рыжскім дагаворам, як і дамовамі з балтыйскімі дзяржавамі. Пры іх заключэнні Масква зрабіла значныя тэрытарыяльныя саступкі і не адмаўлялася ад рэвізіі названых трактатаў. Улічваючы агульны антыверсальскі курс савецкага ўрада, непрымальным было для Расіі і патрабаванне паважаць палажэнні Версальскага дагавора. У. І. Ленін прапаноўваў паспрабаваць на канферэнцыі адмяніць усе ваенныя даўгі і перагледзець Версальскі і ўсе мірныя дагаворы [6, с. 89]. Вядомая была і негатыўная пазіцыя Расіі адносна выканання матэрыяльных абавязацельстваў па Рыжскаму дагавору. Маскву паляпшэнне польска-савецкіх адносін цікавіла перш за ўсё ў плане аддзялення Польшчы ад Францыі. Пра гэта красамоўна сведчыць ацэнка савецкай дыпламатыяй Рыжскага пратакола ад 30 сакавіка 1922 г., падпісанага Расіяй, Польшчай, Эстоніяй, Фінляндыяй і Латвіяй. У дакладзе савецкай дэлегацыі па выніках Генуэзскай канферэнцыі яго падпісанне названа "пачаткам вызвалення Малой Еўропы з-пад уплыву Францыі" [22, с. 5]. 4 красавіка ў лісце на імя Я. С. Ганецкага саветнік паўнамоцнага прадстаўніцтва ў Варшаве Л. Л. Абаленскі прапаноўваў пайсці на саступку Польшчы ў пытанні аб найбольшым спрыянні "каб хоць трохі адцягнуць [Польшчу] ад французскай указкі" [23, с. 500].

На германскім кірунку савецкая дыпламатыя напярэдадні Генуэзскай канферэнцыі была менш актыўнай, чым на польскім. Савецка-германскія перамовы, якія праходзілі ў Берліне, 17 лютага былі перапыненыя. Кіруючыя колы Германіі не рызыкавалі ісці на пагадненне з савецкім урадам да пачатку Генуэзскай канферэнцыі. Яны будавалі разлік на дасягненне пагаднення з Англіяй, каб сумесна працаваць над аднаўленнем эканомікі Расіі. Хоць пры гэтым і асцерагаліся англійскай канкурэнцыі [12, с. 45]. Савецкі ўрад са свайго боку, як адзначалася вышэй, не быў схільны рабіць Германіі саступкі ў эканамічнай галіне нават у абмен на ўсталяванне дыпламатычных адносін. Савецка-германскія перамовы аднавіліся толькі ў пачатку красавіка, калі па дарозе ў Генуе прыбыла ў Берлін расійская дэлегацыя. Аднак і тут немцы не праявілі гатоўнасці да дасягнення пагаднення. У тэлеграме ў НКЗС ад 4 красавіка Г. В. Чычэрын, які ўзначальваў савецкую дэлегацыю, адзначаў: "Немцы вялі перамовы з намі, каб паказаць, што нібыта яны хочуць пагаднення з намі, але па ўсім відаць, што ў сапраўднасці яны хацелі, каб нічога не выйшла" [15, с. 181]. Савецка-германскія перамовы прыцягнулі ўвагу польскага пасольства ў Берліне. У накіраваным у Варшаву паведамленні яно зрабіла выснову, што гэтыя перамовы "не далі канкрэтнага выніку" [9, ł. 12–14].

Такім чынам, напярэдадні Генуэзскай канферэнцыі ў адносінах паміж Савецкай Расіяй і Польшчай, Савецкай Расіяй і Германіяй назіраліся супярэчлівыя тэндэнцыі. З аднаго боку, абазначылася агульнасць інтарэсаў названых дзяржаў у сувязі з маючым адбыцца міжнародным форумам. Імкненне савецкага ўрада атрымаць міжнароднае прызнанне знаходзіла разуменне ў Варшаве і Берліне. Польшча і Германія праз паляпшэнне стасункаў з Масквой імкнуліся заняць годнае месца ў працэсе эканамічнага аднаўлення Расіі. Вынікам стала пэўнае паляпшэнне адносін Расіі з Польшчай і Германіяй у першыя месяцы 1922 г. Але яно не мела належнай устойлівасці ў сілу наяўнасці ў адносінах паміж трыма краінамі вострых праблем, іх рознага становішча ў існаваўшай сістэме міжнародных адносін. У выніку справа не дайшла да падпісання якіх-небудзь значных дамоўленасцяў і ўзгаднення пазіцый Расіі і Германіі, Расіі і Польшчы на маючай адбыцца канферэнцыі. Новая расстаноўка сіл у Цэнтральна-Усходняй Еўропе аформілася ўжо на Генуэзскай канферэнцыі ў сувязі з падпісаннем Рапальскага дагавора. Вырашальным у гэтай расстаноўцы з'яўлялася стаўленне да Версальскага міжнароднага парадку. У Цэнтральна-Усходняй Еўропе ён вызначаўся асаблівай няўстойлівасцю. Гэтую тэндэнцыю не змагла пераадолець ні Генуэзская, ні наступныя міжнародныя канферэнцыі. Названая няўстойлівасць Версальскай сістэмы на яе ўсходняй перыферыі стане адным з фактараў фарміравання перадумоў Другой сусветнай вайны.

## Крыніцы і літаратура

1. Катасонов, В. Ю. Генуэзская конференция в контексте мировой и российской истории / В. Ю. Катасонов. – М. : «Кислород», 2015. – 240 с.

2. Шишкин, В. А. Становление внешней политики послереволюционной России (1917–1930 годы) и капиталистический мир. От революционного «западничества» к «национал-большевизму» (Очерк истории) / В. А. Шишкин. – Ст.–Пт. : Издательство «Дмитрий Буланин», 2002. – 360 с.

3. Сергеев, Е. Ю. Большевики и англичане. Советско-британские отношения, 1918–1924 гг.: от интервенции к признанию / Е. Ю. Сергеев. – СПБ. : Наука, 2019. – 831 с.

4. Зубачевский, В. А. Политика России в Центрально-Восточной Европе (первая треть XX века): Геополитический аспект / В. А. Зубачевский. – Омск : Изд-во ОмГПУ, 2018. – 396 с.

5. В. И. Ленин. Неизвестные документы. 1891–1922 гг. – М. : Российская политическая энциклопедия» (РОССПЭН), 2000. – 607 с.

6. Хормач, И. А. Советское государство на международной конференции в Генуе по экономическим и финансовым вопросам / И. А. Хормач // Новая и новейшая история. – 2020. – № 3. – С. 80–106.

7. Советско-германские отношения от переговоров в Брест-Литовске до подписания Рапалльского договора. Сб. докум. Ред. коллегия: С. Дёрнберг, Х. Зайдевиц, И. Н. Земсков и др. : в 2 т. – М. : Политиздат, 1971. – Т. 2: 1919–1922 гг. – 598 с.

8. Коминтерн и идея мировой революции. Документы. – М. : Наука, 1998. – 949 с.

9. Archiwum Akt Nowych (AAN). – Ambasada RP w Berlinie. Sygn. 784.

10. Мезга, Н. Н. В тисках Рапалло: германский фактор в польско-советских отношениях 1921–1926 годов / Н. Н. Мезга. – Гомель : УО «ГГУ им. Ф. Скорины». – 198 с.

11. Москва – Берлин : политика и дипломатия Кремля, 1920–1941 : сб. док. в 3 т. / отв. ред. Г. Н. Севостьянов. – М. : Наука, 2011. – Т. 1: 1920–1926. – 1031 с.

12. Ахтамзян, А. А. Рапалльская политика. Советско-германские отношения. 1922–1932 / А. А. Ахтамзян. – М. : Международные отношения, 1974. – 303 с.

13. Dokumenty do historii stosunków polsko-sowieckich 1918–1945 : w 4 t. – Warszawa : Centrum Polsko-Rosyjskiego Dialogu i Poruzumienia, 2020. – Tom I: 1918–1926. Część 2: Poszukiwfnie normalizacji (kwiecień 1921 – maj 1926). – 950 s.

14. Документы и материалы по истории советско-польских отношений : в 14 т. / Отв. ред. И. А. Хренов, Т. Цесляк. – М. : Наука, 1966. – Т. 4: Апрель 1921 г. – май 1926 г. – 562 с.

15. Документы внешней политики СССР : в 24 т. – М. : Госполитиздат, 1963. – Т. 5. – 807 с.

16. Materski, W. Na widecie: II Rzeczpospolita wobec Sowietów, 1918–1943 / W. Materski. – Warszawa : Instytut Studiów Politycznych PAN, RYTM, 2005. – 776 s.

17. Depesze Poselstwa Rzeczypospolitej Polskiej w Londynie : w 2 t.; oprac. W. Rojek, J. Łaptos, A. Suchcitz. – Kraków : Polska Akademia Umiejętności, 2019. – T. 1: czerwiec 1919 – marzec 1923. – 588 s.

18. Пратакол пасяджэння Палітбюро № 92/а ад 31 студзеня 1922 г. [Электроны рэсурс]. – Режым доступу : http://sovdoc.rusarchives.ru/#showunit&id=14797;tab=img0018. – Дата доступу: 20. 05. 2018.

19. AAN. – Ministerstwo Spraw Zagranicznych. Sygn. 6629. B. 22908.

20. Материалы Генуэзской конференции. – М. : Изд. НКИД, 1922. – 459 с.

21. Архив внешней политики Российской Федерации. – Ф. 122. Оп. 5. Д. 3.
22. Иоффе, А. А. От Генуи до Гааги. Сборник статей / А. А. Иоффе. – М. : Госиздат, 1923. – 43 с.
23. Советско-польские отношения в 1918–1945 гг.: Сборник документов : в 4 т. / Под общ. ред. М. М. Наринского, А. В. Мальгина. – М. : Издательство «Аспект-Пресс», 2017. – Т. 1: 1918–1926. – 628 с.

УДК 94

**Д. В. Родин**
Московский государственный
университет имени М. В. Ломоносова

# ПРОЕКТЫ «НОВЫХ ЛОКАРНО» КАК МЕХАНИЗМ СТАБИЛИЗАЦИИ ВОСТОЧНОЙ ЕВРОПЫ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ 1920-Х ГОДОВ[1].

*После успеха Локарнской конференции 1925 г. одним из факторов международной жизни стало обсуждение проектов «новых Локарно» для Балтийского, Дунайского и Балканского регионов. В случае успеха подобные проекты могли способствовать стабилизации международных отношений на востоке Европы и укреплению Версальского миропорядка. Однако ввиду неразрешенных конфликтов между малыми странами, противодействия со стороны различных государств (Германия, Советский Союз, Венгрия) и отказа Великобритании активно участвовать в жизни Восточной Европы идеи «новых Локарно» так и не были претворены в жизнь.*

Вторая половина 1920-х гг., известная в историографии как «эра пацифизма» или «период временной стабилизации капитализма», может быть в равной степени обозначена и как «эра Локарно». Прошедшая в октябре 1925 г. Локарнская конференция и подписанные по ее итогам договоры – Рейнский гарантийный пакт и арбитражные соглашения

---

[1] Исследование выполнено за счет гранта Российского научного фонда «“Воображаемые регионы” между двумя мировыми войнами: проблемы конструирования и управления», № 24-18-00461, https://rscf.ru/project/24-18-00461/.
The study was supported by the Russian Science Foundation, grant No 24-18-00461, https://rscf.ru/project/24-18-00461/, “‘Imagined regions’ between the two worlds wars: the problems of construction and management”.